**А.І. Марэцкі,** *дацэнт*

# ДА ПРАБЛЕМЫ АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ФАКУЛЬТЭТА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ

Сумяшчэнне працоўнай дзейнасці і вучобы студэнтамі-завочнікамі, асабліва ў сувязі са скарачэннем працягласці лабараторна-экзаменацыйных сесій, павелічэннем аб'ёму неабходнай вучэбнай інфармацыі і лімітаванымі тэрмінамі навучання, звязана з вельмі вялікімі цяжкасцямі. У іх пераадоленні і паспяховай вучобе значнае месца займае правільная арганізацыя вучэбнага працэсу. Дапамагчы ў гэтым павінен прафесарска-выкладчыцкі калектыў універсітэта.

Безумоўна, такая акалічнасць выклікае неабходнасць пошуку формаў і метадаў удасканалення вучэбнага працэсу. Таму вялікая ўвага надаецца інтэнсіфікацыі і аптымізацыі ўсяго комплексу вучэбна-выхаваўчай работы на факультэце. Сярод галоўных фактараў павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці трэба выдзеліць арганізацыю навукова абгрунтаванага планавання самастойнай работы студэнтаў.

Гэта ў сваю чаргу змяняе і характар выкладання. Так, на ўстановачнай сесіі перад выкладчыкамі стаіць задача даць не столькі сістэму ведаў, колькі ўяўленне аб вучэбнай дысцыпліне ў цэлым, яе структуры і змесце, звярнуць увагу студэнтаў на найбольш фундаментальныя паняцці вучэбнага курса і, што не менш важна, указаць шляхі самастойнага авалодання ведамі, навыкамі і ўменнямі. Задача агляднай лекцыі – дапамагчы студэнту абагульніць самастойна вывучаны ў міжсесіённы перыяд матэрыял, прывесці яго ў сістэму, даць адказы на найбольш складаныя пытанні, якія ўзніклі ў студэнтаў. Адсюль выцякаюць асобыя патрабаванні да аб'ёму і характару інфармацыі, якая паведамляецца выкладчыкам, методыцы яе данясення студэнтам. Улічваючы, што асноўная частка вучэбнага матэрыялу выносіцца на самастойнае вывучэнне, вялікае значэнне мае распрацоўка заданняў пошукавага, творчага характару. Навучанне методыцы самастойнай работы па засваенні вучэбнага матэрыялу, яе планаванні і арганізацыі з'яўляецца адным з важных кампанентаў дзейнасці выкладчыкаў.

Самастойная вучэбная работа студэнтаў-завочнікаў у міжсесіённы перыяд знаходзіцца ў цеснай узаемасувязі з выкладаннем. Па сутнасці, яна з'яўляецца працягам той дзейнасці, якая была пачата на ўстановачнай сесіі. Яе мэта – засваенне ведаў, авалоданне ўменнямі і навыкамі, асновы для развіцця якіх былі закладзены на аўдыторных занятках. У гэтым плане выкладанне з'яўляецца ключавым момантам у дасягненні поспехаў студэнтамі-завочнікамі.

Выкладанне на завочным факультэце з'яўляецца своеасаблівай сістэмай кіравання самастойнай вучэбнай дзейнасцю студэнтаў і ўключае наступныя структурныя элементы:

– пастаноўка мэты і задач вучэбнага курса;
– вызначэнне аб'ёму і зместу вучэбнага матэрыялу;
– выбар сродкаў і спосабаў перадачы ведаў;
– тлумачэнне вучэбнага матэрыялу студэнтам на аўдыторных занятках;
– планаванне і арганізацыя самастойнай вучэбнай работы студэнтаў, распрацоўка метадычных рэкамендацый па вывучэнні адпаведнай дысцыпліны;
– кіраванне самастойнай работай студэнтаў у міжсесіённы перыяд;
– кантроль за якасцю ведаў студэнтаў.

Такім чынам, дзейнасць выкладчыка на завочнай форме навучання ўмоўна можна падраздзяліць на тры часткі:

– падрыхтоўчая (падрыхтоўка да вучэбных заняткаў і планаванне самастойнай работы студэнтаў);
– непасрэдная работа са студэнтамі ў перыяд лабараторна-экзаменацыйных сесій;
– апасродкаванае кіраванне самастойнай работай студэнтаў у перыяд паміж сесіямі.

Пры ўсёй значнасці кожнай з гэтых частак трэба выдзеліць асаблівую ролю першай, калі закладваюцца асновы кіравання самастойнай вучэбнай работай студэнтаў. Менавіта на гэтым этапе праграміруецца ўся сістэма педагагічнага ўздзеяння: вызначэнне аб'ёму самастойнай работы, распрацоўка дамашніх заданняў, падрыхтоўка пісьмовых метадычных указанняў і інш.

Яшчэ раз падкрэслім, што інтэнсіфікацыя вучэбнага працэсу адбываецца галоўным чынам праз дасягненне максімальнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эфектыўнасці самастойнай работы ў міжсесіённы перыяд, што, у сваю чаргу, патрабуе стараннай навукова абгрунтаванай рэгламентацыі і планавання самастойнай работы ва ўсёй разнастайнасці яе аспектаў. Кафедры, якія забяспечваюць вучэбны працэс на факультэце, як правіла, плануюць самастойную работу студэнтаў без уліку рэальнага бюджэту часу і без узаемнай каардынацыі, што прыводзіць да нежаданай перагрузкі, нізкай якасці засваення матэрыялу.

Раней праведзенае даследаванне бюджэту часу студэнтаў паказала, што самастойная работа штотыднёва паміж сесіямі вызначаецца 15–17 гадзінамі (фактычныя затраты часу яшчэ меншыя). Прыведзеныя даныя аказаліся значна меншымі ад запланаванага кафедрамі часу для выканання патрэбнага аб'ёму вучэбных заняткаў.

У сувязі з гэтым неабходна ажыццявіць планаванне самастойнай работы па ўсіх курсах аднолькава, зыходзячы з рэальнага бюджэту часу студэнтаў. Пры гэтым абгрунтаваныя ліміты часу павінны адпавядаць удзельнай вазе кожнай дысцыпліны ў вучэбным плане, уключаючы карэкціроўку ў залежнасці ад працаёмкасці, забяспечанасці вучэбна-метадычнымі комплексамі, электроннымі сродкамі і г.д. Каэфіцыент працаёмкасці вызначаецца зыходзячы з суадносін затрат часу на падрыхтоўку прадмета і на аўдыторныя заняткі, вылічаных для стацыянара. Такое планаванне павінна праводзіцца не толькі па сукупнасці ўсіх дысцыплін курса, але і ў ланцугу дысцыплін усіх курсаў. Пасля рэгламентацыі самастойнай работы па курсах і дысцыплінах неабходна зрабіць размеркаванне бюджэту часу ўнутры кожнай дысцыпліны па відах работы: выкананне кантрольнай, курсавой работы, падрыхтоўка да залікаў, экзаменаў.

З мэтай выяўлення эфектыўнасці вучэбнага працэсу сярод студэнтаў дэканат і кафедры неаднаразова праводзілі пісьмовае і вуснае апытанне ў перыяд правядзення лабараторна-экзаменацыйных сесій. Апошняе праводзілася ў студзені бягучага года ў перыяд правядзення лабараторна-экзаменацыйнай сесіі студэнтаў V курса. У апытанні ўдзел бралі 336 рэспандэнтаў, што складае звыш 86% колькасці студэнтаў названага курса.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнты-завочнікі дастаткова высока ацэньваюць ролю вучэбных заняткаў ва універсітэце як у плане атрымання дапамогі ў засваенні вучэбнага матэрыялу, так і ў авалоданні методыкай самастойнай работы. Сярод відаў заняткаў, якія ў найбольшай ступені дапамагаюць засвоіць вучэбны матэрыял, звыш 55% апытаных назвалі лекцыю, 37% – семінарскія заняткі. На аддзяленні музычнага мастацтва падкрэслена і роля індывідуальных заняткаў з выкладчыкам па дысцыплінах спецыялізацый – 26%. Дарэчы, 66% рэспандэнтаў задаволены якасцю правядзення індывідуальных заняткаў. Але ў даследаванні 1998 г. колькасць задаволеных гэтай формай заняткаў была большай і складала 68%, а ў даследаванні 1994 г. – 77%. Асобае месца ў рабоце са студэнтамі-завочнікамі, асабліва тымі, хто не можа па тых ці іншых абставінах выкарыстоўваць электронны варыянт, займае вучэбна-метадычная літаратура, якая распрацоўваецца выкладчыкамі універсітэта. Побач з лекцыямі яна з'яўляецца асноўнай крыніцай атрымання звестак па методыцы выканання вучэбных заданняў у міжсесіённы перыяд для 48% апытаных.

87% рэспандэнтаў адказалі, што вучоба ва універсітэце развівае прафесійныя інтарэсы і здольнасці, 67% падкрэслілі, што універсітэт апраўдаў іх надзеі. Праўда, каля 30% адзначылі, што вучоба ва універсітэце ў пэўнай ступені не апраўдала іх мар і надзей. Разам з тым ні адзін студэнт не спасылаўся на недастатковы ўзровень прафесійнага майстэрства выкладчыкаў.

Сярод прычын, якія не дазваляюць вучыцца з поўнай аддачай, названы розныя. Побач з аб'ектыўнымі (вялікая занятасць на рабоце – 52%) называюцца і суб'ектыўныя (няўменне правільна размяркоўваць свой час – 36%, не хапае цярпення займацца – 25% і інш.).

Значная доля студэнтаў несістэматычна працуюць над засваеннем вучэбнага матэрыялу ў міжсесіённы перыяд. Пасля завяршэння лабараторна-экзаменацыйнай сесіі студэнты, як правіла, пачынаюць падрыхтоўку да чарговай не раней чым праз 10 дзён. І гэта зразумела. Фізіялагічна мозг стаміўся атрымліваць новую інфармацыю, патрабуецца адпачынак. Але ў 10% апытаных ён доўжыцца месяц, а можа і болей, 26% - займаюцца толькі па выхадных днях, 22% – ад выпадку да выпадку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У поўным аб'ёме рэкамендуемую літаратуру па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах вывучалі 39% студэнтаў аддзялення інфармацыйна-дакументных камунікацый, 32% – аддзялення культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці, 28% – аддзялення музычнага мастацтва і 25% – аддзялення традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва.

Ацэньваючы свае ўменні самастойна працаваць над вучэбнымі заданнямі, толькі 51% адзначылі, што працуюць дастаткова добра. Пры гэтым, калі на аддзяленні інфармацыйна-дакументных камунікацый ад курса да курса расце колькасць студэнтаў, якія валодаюць навыкамі самастойнай вучэбнай работы (I курс – 51%, III курс – 57%, V курс – 69%), то на іншых аддзяленнях мы не назіраем такой тэндэнцыі (I курс – 51%, III курс – 39%, V курс – 58%). Каля 40% апытаных працуюць у міжсесіённы перыяд без папярэдне складзенага плана.

Аб недахопах у арганізацыі кіравання самастойнай вучэбнай работай студэнтаў сведчаць і факты фармальнага падыходу да рэцэнзавання кантрольных і курсавых работ, недаацэнка ў радзе выпадкаў ролі ўстановачных лекцый, адсутнасць падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

Па інфармацыі структурных падраздзяленняў іншых ВНУ, самі выкладчыкі не ў поўнай меры валодаюць методыкай навучання студэнтаў навыкам самастойнай работы. Толькі каля 3% выкладчыкаў гавораць аб тым, што яны дапамагаюць студэнтам у складанні графіка самастойнай работы, звыш 17% – планаванні самастойнай работы ў міжсесіённы перыяд. Па выніках апытання нашых выкладчыкаў высветлілася, што ў нашым універсітэце карціна прыблізна такая ж.

Звыш 90% студэнтаў лічаць, што найбольшыя складанасці пры самастойнай рабоце ў іх звязаны з агульнанавуковымі дысцыплінамі. У той жа час адзначым, што адзін і той жа прадмет выклікае розныя цяжкасці ў залежнасці ад канкрэтных выкладчыкаў, якія вялі вучэбны працэс на розных патоках. Вынікі здачы залікаў ці экзаменаў ў такіх выпадках розныя. Тут трэба гаварыць аб адсутнасці адзінства патрабаванняў да ведаў студэнтаў на кафедрах і ў прадметных камісіях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Павышэнне эфектыўнасці завочнай формы навучання звязана таксама з патрабавальнасцю да ацэнкі ведаў студэнтаў. Большасць студэнтаў (да 70%) ацанілі заданні міжсесіённага перыяду як цяжкія, для выканання якіх неабходна выкарыстанне некалькіх крыніц, а таксама аналіз практыкі. І з гэтым нельга не пагадзіцца. І ў той жа час больш паловы апытаных, якія займаюцца нерэгулярна, не ў поўную сілу, паспяхова здавалі залікі і экзамены.

Навучанне методыцы самастойнай работы па засваенні вучэбнага матэрыялу, яго планаванні і арганізацыі – адзін з важнейшых кампанентаў дзейнасці выкладчыка. Абавязковай умовай паспяховай арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу на факультэце з'яўляецца поўная забяспечанасць вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратурай. Таму па-ранейшаму на парадку дня стаіць праблема стварэння спецыяльных вучэбна-метадычных комплексаў і іх электронных версій. Адносіны студэнтаў да выкарыстання электронных сродкаў вельмі станоўчыя, але ў ходзе апытання высветлілася, што, на жаль, толькі каля 10% могуць іх выкарыстоўваць. Таму па-ранейшаму асобае месца ў рабоце з завочнікамі займае распрацаваная выкладчыкамі універсітэта вучэбна-метадычная літаратура. Побач з лекцыямі яна з'яўляецца асноўнай крыніцай атрымання звестак па методыцы выканання вучэбных заданняў у міжсесіённы перыяд. Між тым не задаволена метадычным забеспячэннем вучэбных дысцыплін палова апытаных (61% рэспандэнтаў аддзялення культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці, 49 – мастацкай творчасці, 48 – традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва і 42% – інфармацыйна-дакументных камунікацый).

Адзначыўшы станоўчую ролю метадычнай дапамогі выкладчыкаў у фарміраванні навыкаў самастойнай работы, звыш 40% апытаных аддзялення інфармацыйна-дакументных камунікацый і звыш 50% іншых аддзяленняў адзначылі, што адным з асноўных шляхоў яе актывізацыі з'яўляецца метад уласных проб і памылак.

Нам трэба шырэй укараняць індывідуалізацыю дамашніх заданняў па спецыяльных дысцыплінах, у большай ступені ўлічваць характар работы студэнтаў, іх вопыт. Кантрольныя і курсавыя работы павінны насіць пошукавы, творчы характар. Важна таксама распрацаваць практычныя заданні, якія дазваляюць ажыццяўляць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паэтапны кантроль за самастойнай работай студэнтаў, прывесці ў адпаведнасць з рэальным бюджэтам часу студэнтаў аб'ём рэкамендуемай літаратуры.

Адным з фактараў удасканалення работы на факультэце выступае мэтанакіраваная актывізацыя асабістага патэнцыялу студэнтаў. Відавочна неабходнасць ператварэння студэнта з пасіўнага рэцыпіента зададзеных інфармацыйных патокаў у актыўнага ўдзельніка засваення, фарміравання і мадыфікацыі дынамічнай сістэмы прафесійных ведаў і навыкаў. Як крок у гэтым кірунку можна разглядаць укараненне ў практыку падрыхтоўкі студэнтаў свабоднага выбару прафілюючых дысцыплін з улікам спецыялізацыі, што ўжо робіцца ў іншых ВНУ.

На першым этапе рэалізацыі гэтай задумы кафедры вызначаюць цыклы курсаў, якія складаюць тэарэтычнае ядро будучай спецыяльнасці. З'яўляючыся абавязковым кампанентам прафесійнай падрыхтоўкі, яны займаюць каля 50% фонду вучэбных гадзін, якія адводзяцца на спецыялізацыю. Астатнія гадзіны ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі размяркоўваюцца паміж спецдысцыплінамі, канкрэтны выбар якіх складаецца з улікам студэнцкай аўдыторыі. Такі падыход да фарміравання комплексу дысцыплін па спецыялізацыі, з аднаго боку, павышае адказнасць кафедраў і выкладчыкаў за спецкурсы, з другога боку, садзейнічае актыўнаму ўключэнню студэнтаў у арганізацыю вучэбнага працэсу на старшых курсах, дазваляе цесна звязаць вучобу з патрабаваннямі практыкі.

Пастаўленая праблема патрабуе вырашэння шэрага арганізацыйных пытанняў. Адно з іх – улік гадзін выкладчыкам, якія ў дзень завочніка праводзілі кансультацыйную работу. Раней гэтыя гадзіны запісваліся на кафедрах у журналах нагрузкі з указаннем прозвішчаў студэнтаў, якія атрымалі кансультацыю. Такая практыка існуе і цяпер у шэрагу універсітэтаў. Так, у БДПУ імя М. Танка плануецца ў перыяд правядзення дня завочніка вылучаць па 6 гадзін на самастойную работу. Дарэчы, не толькі праблема арганізацыі самастойнай работы студэнтаў завочнай формы навучання, а ўвогуле завочная падрыхтоўка спецыялістаў даўно заслугоўвае ўвагі адпаведных структур, у тым ліку Міністэрства адукацыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ